# ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!**

*ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно»* **№ 20 (сакавік)**







## ПАПЯРОВЫ ПОГЛЯД



**З даўніх часоў ва ўмовах адсутнасці тэхнічных сродкаў для адлюстравання з'яў рэчаіснасці людзі пачалі выкарыстоўваць фарбы. Партрэты з цягам часу набывалі папулярнасць і вылучаліся сваёй каштоўнасцю. У сучасным грамадстве, нягледзячы на існаванне розных прылад, з дапамогай якіх мы можам захаваць у памяці яркія моманты жыцця і рысы знешняга выгляду людзей, што выклікаюць нашу цікавасць і прыцягваюць нашу ўвагу, выяўленчае мастацтва не губляе сваёй актуальнасці. Пераканаўчым прыкладам гэтага з'яўляецца творчая дзейнасць Марыі КРАЎЧАНКІ, вучаніцы дзясятага класа нашай установы адукацыі.**







**(Інтэрв'ю з творцай, падрыхтаванае Ксеніяй ГУРЭНЧЫК, чытайце на стар. 4).**

8 САКАВІКА - МІЖНАРОДНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ

# МАЦІ – ГЭТА СОНЦА

**МАЦІ… Здавалася б такое маленькае слова, але якое вялікае значэнне яно мае для кожнага з нас. Маці заўсёды клапоціцца пра нас, падтрымлівае ў цяжкую хвіліну і падзяляе разам з намі імгненні радасці, дорыць нам шчасце і спакой. Не існуе на свеце больш роднага і дарагога сэрцу чалавека за любую матулю, адзіную і непаўторную.**

Напярэдадні свята вясны і прыгажосці мы пацікавіліся, якім жа сэнсам напоўнена слова маці для вучняў малодшых класаў СШ № 2?



**ІВАН ЧЭЧАТ:** *— Маці — любоў, прыгажосць, радасць.*

**УЛАДА ЯГОРАВА:** *— Матуля — ласкавы зайчык, мая прынцэса.*

**ІРЫНА БЯРНАЦКАЯ:** *— Матуля — гэта яркае сонейка.*

**ЛІЗАВЕТА МАРОЗ:** *— Матуля — сонейка, ластаўка, самы дарагі чалавек, лепшы ў свеце сябар.*

**СЯРГЕЙ БАРЫСЁНАК:** *— Маці —гэта гаспадыня ў кожным доме.*

**КАНСТАНЦІН ВАЙЦЯХОВІЧ:** *— Матуля — гэта жыццё, сонца, свет, радасць.*

**АЛІНА СІДАРОВІЧ:** *— Маці — сонца, зайчык, вясёлка.*

**ЯРАСЛАЎ ШЫК:** *— Матуля — гэта ўсё.*

**АЛЯКСАНДРА ЯГОРАВА:** *— Маці — сонейка, прыгажосць, шчасце.*

**Гутарыла Ксенія ГУРЭНЧЫК.**
**Фота Яўгеніі ГАЛУЗЫ.**

## 175 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ФРАНЦІШКА БАГУШЭВІЧА (1840–1900)




*“Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі…” – з такім заклікам любіць і шанаваць родную мову звяртаўся да беларусаў у прадмове да свайго першага зборніка вершаў “Дудка беларуская” паэт, публіцыст, празаік і перакладчык Францішак Багушэвіч, з імем якога даследчыкі звязваюць развіццё і станаўленне беларускай літаратурнай мовы, а таксама нараджэнне беларускай байкі.*

# “НАВУКА. ПРЫРОДА. ЧАЛАВЕК”

***Яшчэ са старажытнасці людзі пачалі верыць у цуд. У казках можна сустрэць такія фантастычныя рэчы, як дыван-самалёт, боты-хуткаходы, пуцяводны клубок і іншыя.***

***Калі падумаць, то ў нас усё гэта ёсць. Цуд? Не... Навука! Навука, вось што дае адказы на многія нашы пытанні. Тое, што для нашых продкаў было фантастыкай, для нас - звычайныя рэчы.***

***Але якое значэнне будуць мець навуковыя адкрыцці, калі пра іх не будзе вядома? Па гэтай прычыне 24 сакавіка ў актавай зале нашай установы адукацыі была праведзена раённая навукова-практычная канферэнцыя пад назвай “Навука. Прырода. Чалавек”, прыняўшы ўдзел у якой, 85 юных даследчыкаў змаглі падзяліцца з прысутнымі вынікамі сваіх даследаванняў.***

***Пасля пленарнага пасяджэння ўдзельнікі канферэнцыі разышліся па прадметных секцыях, каб заслухаць даклады, звязаныя з навукова-практычнай дзейнасцю вучняў пад кіраўніцтвам педагогаў.***

***На адной з секцый, якая датычылася беларускай мовы і літаратуры, мне давялося папрысутнічаць асабіста. Тут было заслухана 8 вучнёўскіх работ. Паспрабавалі сябе ў ролі навукоўцаў і вучаніцы нашай школы Ксенія ГУРЭНЧЫК, якая займалася даследаваннем літаратуры і моўных з’яў па тэме “Намінацыі кветкавых раслін у паэзіі Васіля Віткі”, і Аляксандра ДУДКО - з працай па тэме “Зваротак як сродак мастацкай выразнасці ў беларускай мове, беларускай народнай творчасці”. Рашэннем журы на вышэйназванай секцыі былі адзначаны такія даследчыя працы, як “Беларус на Беларусі, быццам чужаземец” і “Паэты жывуць у песнях”.***



*Аліна ВАСІЛЬКОВА, вучаніца 5”Б” класа, брала ўдзел у навукова-практычнай канферэнцыі вучняў, прадстаўляючы ўвазе прысутных вынікі сваёй даследчай дзейнасці па тэме “Перавага і недахоп фарбаў, прыгатаваных у хатніх умовах”. Кіраўніком праекта выступіла настаўніца працоўнага навучання СШ № 2 горада Беразіно Галіна Міхайлаўна ГУБІЧ. Работа была адзначана журы і выбрана для далейшага ўдзелу ў абласным этапе навукова-практычнай канферэнцыі.*

Сваімі думкамі і ўражаннямі пасля мерапрыемства з намі падзялілася юная даследчыца - Аліна ВАСІЛЬКОВА:

- З дзяцінства захапляюся маляваннем. Свой першы малюнак стварыла ў двухгадовым узросце, але пахваліцца сваімі творчымі дасягненнямі ў галіне мастацтва змагла толькі ў 5 гадоў. Галіна Міхайлаўна, ведаючы пра маё захапленне, прапанавала мне паспрабаваць свае сілы ў даследчай дзейнасці і прыняць удзел у навукова-практычнай канферэнцыі. Праект захапіў мяне цалкам. Вельмі цікава і незвычайна было ствараць розныя фарбы са стрыжняў для ручак і фламастараў. Адчуваеш сябе сапраўдным “алхімікам” і чараўніком! Шкада толькі, што немагчыма замяніць усю палітру колераў, выкарыстоўваючы падручны матэрыял.

Як высветлілася ў працэсе гутаркі, дзяўчынка ў будучым марыць звязаць сваю прафесійную дзейнасць з мастацтвам. Пажадаем Аліне поспехаў на абласной канферэнцыі. І хай яе мары здзейсняцца!

# ЗІМОВЫЯ КВЕТКІ

***Цешыцца прыгажосцю кветак зімой прыемна любому чалавеку, яшчэ больш прыемна, калі далікатныя бутоны распускаюцца дома на падаконніку. Такога чараўніцтва дазваляе дамагчыся “выганка” цюльпанаў. І не бяда, калі перш вам не даводзілася мець справу з цюльпанамі: навучыцца “выганяць” гэтыя кветкі ў хатніх умовах пад сілу нават юным кветкаводам.***

**(Працяг на стар. 7).**




Гэта даказаў вучань 3 “Б” класа Канстанцін ВАЙЦЯХОВІЧ. Працуючы над праектам "Цуд сярод зімы", ён паказаў, што любы чалавек, нават маленькі хлопчык, зможа вырасціць выдатныя кветкі ў сябе дома. Але для гэтага неабходна мець пэўныя веды. Да працы над праектам хлопчыка падштурхнуў аповед Таццяны Мікалаеўны ФЯДОТАВАЙ аб тым, што падораны цюльпан прыносіць шчасце. І Косця скіраваў усе свае намаганні на дасягненне пастаўленай мэты - падарыць матулі да свята жывая кветкі.

Пасадачны матэрыял прынёс сябар хлопчыка Ілья Старавойтаў. У кастрычніку цыбуліны былі пасаджаны - і пачаўся працэс вырошчвання кветак. Самым цікавым у гэтай працы было чаканне выніку.

# ПАПЯРОВЫ ПОГЛЯД

**(Працяг.**
**Пачатак на стар. 1).**

***- Марыя, у якім узросце ты пачала маляваць? Што гэтаму паспрыяла?***

- Маляваць я пачала адносна нядаўна, ва ўзросце чатырнаццаці гадоў. Дадзены занятак – стан душы, дзе немалаважная роля належыць узаемаадносінам з аднакласнікамі і прыродзе.

***- Ці памятаеш ты свой першы шэдэўр? Якім ён быў?***

- Першым маім малюнкам з’яўляецца партрэт матулі, які быў створаны зусім па-дзіцячы.

***- Чаму менавіта партрэты?***

- Таму што людзі, на мой погляд, — гэта лепшае, што ёсць у свеце. Мне падабаецца з дакладнасцю перадаваць кожную рыску твару чалавека.

***- М а р ы я , дзе ж крыніца твайго натхнення?***

- З н а ч н ы ўплыў маюць творы мастацкай літаратуры, прыгажосць і багацце навакольных краявідаў.

***- Чаму ў тваіх малюнках пераважаюць шэрыя колеры?***

- Яркія колеры не выклікаюць маёй цікавасці.

***- Леў Мікалаевіч Талстой пісаў, што «вочы - люстэрка душы». Ці згодна ты з дадзеным меркаваннем?***

- Я лічу, што погляд удала перадае намеры чалавека і яго настрой.

***- Якімі асабліваціямі трэба вылучацца, каб стаць героем аднаго з тваіх будучых партрэтаў?***

- У мяне няма ідэалаў. У асноўным героямі карцін становяцца знаёмыя мне людзі.

***- Творчасць якога мастака цябе захапляе?***

- Маім кумірам-творцам з’яўляецца Сальвадор Далі, карціны якога, напоўненыя глыбокім філасофскім сэнсам, прымушаюць задумацца аб надзённым і дапамагаюць знайсці каштоўнасныя арыенціры.

***- Што ты можаш пажадаць тым, хто яшчэ толькі марыць далучыцца да мастацтва?***

- Не баяцца адкрываць у сабе штосьці новае, вучыцца і верыць, што ўсё абавязкова атрымаецца.

# ЮНЫЯ НАСТАЎНІКІ



***18 сакавіка ў СШ № 2 прайшоў дзень самакіравання. Гэта адзін з вучэбных дзён, на працягу якога арганізацыю ўрочнай дзейнасці і пазакласную працу бяруць на сябе вучні старэйшых класаў.***

***Спіс настаўнікаў-дублёраў складаецца з улікам пажаданняў вучняў, разглядаецца і зацвярджаецца педагогамі і адміністрацыяй школы. Вучні, абраныя ў якасці настаўнікаў, абавязаны напісаць планы-канспекты ўрокаў, тэмы якіх павінны адпавядаць каляндарна-тэматычнаму планаванню.***

***Гэта мерапрыемства дае магчымасць юным настаўнікам адчуць увесь цяжар педагагічнай справы. А што скажуць наконт гэтага дня самі вучні, якім давялося паспрабаваць свае сілы ў ролі настаўніка?***



**Яфім КАПЛІЙ (настаўнік біялогіі):**

- Да дня самакіравання я не мог уявіць, з якімі цяжкасцямі звязана праца настаўнікаў. Але, як і ў любой прафесіі, тут ёсць свае мінусы і плюсы. На працягу ўсяго вучэбнага дня мне давялося наведваць урокі ў якасці настаўніка біялогіі. Старэйшыя класы, на дзіва, сядзелі ціхенька і ўважліва слухалі тое, што я ім тлумачыў. Увогуле, я лічу, што хоць і складаная гэтая прафесія, але цікавая.



**Макар ШПАКОЎСКІ (настаўнік геаграфіі):**

- Дзень самакіравання прайшоў паспяхова і добра. Уражанні і эмоцыі толькі станоўчыя. Вельмі грунтоўны вопыт назапашаны мною ў час працы з вучнямі. Асабліва спадабалася мне знаёміць сваіх выхаванцаў з новай тэмай, у працэсе тлумачэння якой да мяне звярталіся з пытаннямі, называючы Макар Аляксандравіч.



**Даніiл КРЫЖБЕРСКІ (настаўнік пачатковых класаў):**

- Мне вельмі спадабалася настаўнічаць у першым класе. Галоўнае ў працы з пачатковымі класамі, на мой погляд, адначасова выконваць ролю настаўніка і быць сябрам у адносінах да вучняў. На пачатку я хваляваўся, было цяжкавата, асабліва напружання і сіл патрабавала папярэдняя падрыхтоўка да ўрокаў, напісанне планаў-канспектаў, вывучэнне метадычнай літаратуры, але я справіўся і атрымаў вельмі важны і карысны вопыт.



**Эла КАРПОВІЧ (настаўнік хіміі):**

- Працоўная дзейнасць настаўніка на працягу аднаго вучэбнага дня мне спадабалася цалкам, магчыма, я не паспела за такі кароткі час знайсці мінусы ў гэтай справе. Першыя некалькі хвілін у ролі настаўніка суправаджаліся хваляваннем, а потым усё пайшло добра. Мне б хацелася яшчэ раз увасобіцца ў вобраз педагога, але, на жаль, гэта мой апошні год у школе.

**(Працяг на стар. 7).**

# «АПРЕЛЬ» У ПАЧАТКУ САКАВІКА

*3 сакавіка ў мінскім клубе RE:PUPLIK адбыўся канцэрт шведскай групы "Dead by April". Група з горада Гётэборг была заснавана ў 2007 годзе. Яе музычны напрамак — металкор, тэхна, альтэрнатыўны метал. Яе ўдзельнікі - Крыстафер Андэрсан, Маркус Веслэн, Пантус Эльм, Маркус Розэл. Назва групы адлюстроўвае сумесь музычных жанраў, у якіх выконваюцца песні. Як казаў былы ўдзельнік групы: "Dead — гэта значыць мёртвы, адлюстроўвае жорсткую складаючую нашых песень, у той час, як April — красавік, гэта нешта мяккае і мілагучнае". З моманту заснавання групы было выпушчана тры студыйныя альбомы: Dead by April (2009), Incomparable (2011), Let The World Know (2014).*

**У пачатку канцэртнай праграмы выступіла група "Demotional". Потым быў прадугледжаны перапынак, працягласцю каля 30 хвілін, пасля якога на сцэне з'явіліся чаканыя "Dead by April". Фанаты з радасцю і крыкамі сустрэлі сваіх куміраў. У спіс музычных нумароў увайшлі такія песні, як "Loosing you", "What can i say", "Whithing my heard" і іншыя. Пасля канцэрта можна было сфатаграфавацца з "Demotional", а таксама ўзяць аўтографы ва ўдзельнікаў "Dead by April". Наведаць канцэрт пашанцавала вучаніцам нашай школы Ксеніі НЕСЦЯРОВІЧ і Марыі МІКУЛЬЧЫК. Дзяўчаты падзяліліся з намі сваімі ўражаннямі пасля мерапрыемства.**




**Ксенія:**

- Я даўно марыла з'ездзіць на гэты канцэрт, і вось мара спраўдзілася. Пасля канцэрта засталося мора добрых уражанняў, якіх хопіць на месяц, калі не больш.

**Марыя:**

— Марыла аб гэтым канцэрце ўжо вельмі доўга. Спевакі прыязджалі і раней, але ў мяне не было магчымасці з'ездзіць. Калі я даведалася, што ўсё ж такі паеду, я была вельмі рада, і, як аказалася, не дарма. Падчас чакання «эприлов» публіка не сумавала: усім танцполам скандавалі назву групы, спявалі самыя вядомыя з іх рэпертуару песні, а калі паўза зацягнулася, справа дайшла нават да «Кацюшы» і «Ой, мароз, мароз». Эмоцыі ў тых, хто сабраўся і так ужо білі праз край, таму, калі з'явіліся самі "Dead by April", клуб проста ўзарваўся авацыямі. Удзельнікі групы выкладваліся па поўнай і заразілі сваёй неверагодна пазітыўнай энергіяй абсалютна ўсіх. Музыкі "насіліся" па сцэне, цiснулі рукі захопленым фанатам, рабілі з імі сэлфі, не спыняючыся спяваць, і практычна пасля кожнай кампазіцыі выказвалі сваю любоў да Беларусі і падзяку сваім фанатам. Без сумненняў канцэрт прайшоў «на ўра», пакінуўшы ўсім гледачам мора станоўчых эмоцый і яркіх успамінаў.

**Ксенія ГУРЭНЧЫК.**

# ЗІМОВЫЯ КВЕТКІ

**(Працяг. Пачатак на стар. 3-4).**

Распусцяцца кветкі ці не? І як ўзнагарода за працу і цярпенне цюльпаны парадавалі яркім і дружным красаваннем.

28 сакавіка малодшы навуковы супрацоўнік абараняў сваю даследчую працу на абласным этапе навукова-практычнай канферэнцыі.

У хлопчыка шмат іншых інтарэсаў. Любімым прадметам з'яўляецца матэматыка. У вольны ад вучобы час ён даглядае хатніх гадаванцаў. А кім жа марыць стаць Канстанцін у будучым? Адказ просты. Будаўніком! Каб узводзіць высокія, прыгожыя, утульныя дамы і сваёй дзейнасцю дарыць радасць людям.

**Матэрыялы па выніках навукова-практычнай канферэнцыі падрыхтавалі Алена ЦЭНКЕЛЬ і Юлія ПІСКУН.**
**Фота Яўгеніі ГАЛУЗЫ.**

# ЮНЫЯ НАСТАЎНІКІ



**Аляксей НЕСЦЯРОВІЧ (дырэктар):**

- Мне даручылі выконваць ролю дырэктара нашай навучальнай установы. Дадзеная пасада мне вельмі спадабалася, аднак я не чакаў, што ў адзін дзень чалавек можа сутыкнуцца з такой колькасцю цяжкасцей. Праца добрая, але вельмі адказная. Складана ўтрымаць на сваіх плячах усю школу.

**Марыя МІКУЛЬЧЫК (настаўнік англійскай мовы):**

- Безумоўна, падобныя дні - гэта каштоўны вопыт і для саміх настаўнікаў, і для тых, хто выконвае іх ролю. Спадабалася ўсё: дзеці на ўроках былі стараннымі, імкнуліся плённа працаваць для дасягнення станоўчых вынікаў і добрых адзнак, у старэйшых класах не ўзнікала пытанняў з дысцыплінай. Сумесная праца з вучнямі – дастаткова цікавы занятак.



**Ксенія НЕСЦЯРОВІЧ (настаўнік рускай мовы і літаратуры):**

- Пасля дня самакіравання я зразумела, з якімі цяжкасцямі даводзіцца сутыкацца настаўніку. Даволі складана было ўтрымліваць увагу ўсяго класа. Але і ў працы педагога ёсць месца пазітыву.



**Кацярына МЯТЛІКІНА (педагог сацыяльны):**

- Мая пасада ў дзень самакіравання - педагог сацыяльны. Раней я думала, што гэта не вельмі цяжкая праца, але на справе ўсё аказалася не такім простым. Мне давялося пісаць характарыстыку на вучня, і тут я ў першы раз сутыкнулася з цяжкасцю. На працягу вучэбнага дня я амаль увесь час разам з дырэктарам і яго намеснікамі прымала ўдзел у гутарках падчас разбору спраў, звязаных з вучнямі, якія паспелі "выдзеліцца". Складанасць маёй ролі заключалася ў тым, што трэба было ўмець наладжваць зносіны з вучнямі з мэтай вырашэння праблемы і потым знаходзіць сродак, каб паўздзейнічаць на тых, што правініліся. Ажыццявіць усё, што ўваходзіць у абавязкі педагога сацыяльнага, было даволі не проста, але і ў гэтай прафесійнай дзейнасці дастаткова цікавых момантаў.

**Гутарыла Ксенія ГУРЭНЧЫК.**

# САКАВІЦКІ АБ'ЕКТЫЎ





**Самымі актыўнымі чытачамі цэнтральнай бібліятэкі з'яўляюцца Кацярына АФАНАСЬЕВА (4 «Б»), Яна АЎТУХОВА (8 «Б»), Дзмітрый ЖАЎНЯРОВІЧ (6 «Б»), Анастасія БУРАЯ (3 «А»).**

# ШТО ЧЫТАЕШ, МОЛАДЗЬ?

***У свеце моладзевых захапленняў сучаснасці сусветная павуціна і камп'ютарныя гульні імкнуцца заняць вядучую пазіцыю і адсунуць на другі план кнігу. Але, нягледзячы на дадзеную акалічнасць, кнігі ў бібліятэцы па-ранейшаму знаходзяць сваіх чытачоў, якія і не думаюць здраджваць цікаваму і захапляльнаму падарожжу ў свет твораў мастацкай літаратуры.***

Жыццё школьніка насычана падзеямі - урокі, пазакласныя мерапрыемствы, зносіны з сябрамі і аднакласнікамі. Аднак усё гэта не перашкаджае маладым людзям наведваць бібліятэку. Магчыма, не так маштабна, як гэта было раней, бо ў мінулым крыніцай ведаў заставалася выключна кніга, сёння ж з'явілася шмат дадатковых сродкаў, дзе можна здабыць карысную і цікавую для сябе інфармацыю.

У кола інтарэсаў чытачоў маладога пакалення трапляюць творы розных жанраў. Моладзь цікавіць практычна ўся палітра сусветнай і айчыннай літаратуры. У апошні час сталі вельмі актуальнымі даследаванні чытацкіх інтарэсаў падрастаючага пакалення, вынікі якіх сведчаць, што 50% школьнікаў застаюцца вернымі традыцыйнай кнізе, якая стварае адчуванне кантакту з аўтарам. Старшакласнікі СШ № 2 аддаюць перавагу замежным аўтарам. Найбольшую цікавасць у іх выклікалі серыя раманаў пра Гары Потэра англійскай пісьменніцы Дж. К. Роўлінг, трылогія С. Колінз "Галодныя гульні", «Змярканне» Стэфані Маер, «Дзіцячая кніга» Барыса Акуніна і інш. Вучні сярэдняга звяна цікавяцца кнігамі сучасных расійскіх аўтараў - Кацярыны Вільмант, Святланы Лазаравай, Юрыя Сітнікава, Ганны Усцінавай, Антона Іванова і інш. У малодшых школьнікаў кола чытацкіх захапленняў слаба выяўлена, бо яны кіруюцца пры выбары кнігі школьнай праграмай і рэкамендацыямі класнага кіраўніка. Самымі цікавымі кнігамі сярод пачаткоўцаў лічацца казкі народаў свету, рускіх і замежных пісьменнікаў, творы М. Носава, К.Чукоўскага, Г. Остэра, М.Танка і інш.

**Юлія ПІСКУН.**

ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»
ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА
**ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно»** 223311, горад Беразіно, вуліца Мультана, 19.
**Эл. пошта: berezinosch2.edu@tut.by**
**Сайт: berezino2.schools.by**
Клуб «Юны журналіст»